УДК 2-7(476)

**В. А. Адзіночанка**
ГДУ імя Ф. Скарыны, г. Гомель

# РЭЛІГІЙНАЯ ПРАСТОРА СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ: ПРАБЛЕМА ВЫЗНАЧЭННЯ

*Разглядаецца праблема вызначэння рэлігійнай прасторы сучаснай Беларусі. Само ўвядзенне гэтага паняцця абумоўлена неабходнасцю тэарэтычнага асэнсавання аднаго з аспектаў той сітуацыі, у якой зараз знаходзіцца наша краіна. Рэлігійную прастору можна прааналізаваць праз два вымярэння: гарызантальнае і вертыкальнае. Першае паказвае размяшчэнне рэлігійных арганізацый і культавых аб'ектаў на адпаведнай тэрыторыі і выражае колькасны аспект рэлігійнай прасторы. Вертыкальнае вымярэнне звязана з трактоўкай рэчаіснасці ў той ці іншай рэлігіі, вылучэннем «зямнога» і «нябеснага» свету. Асноўным фактарам развіцця рэлігійная прасторы ў сучаснай Беларусі будзе дзейнасць рэлігійных арганізацый.*

Спачатку мы скажам аб тэарэтычным аспекце праблемы вызначэння рэлігійнай прасторы Беларусі. Яго разгляд прадугледжвае выхад на ўзровень даволі складаных разважанняў і выкарыстанне канцэпцый аўтараў, якія адносяцца да класікаў сусветнай сацыяльнай думкі. Гэта абумоўлена перш за ўсё той сітуацыяй, у якой зараз знаходзіцца наша краіна. Найбольш часта яна акрэсліваецца як трансфармацыя ўсіх бакоў грамадскага жыцця. Апошнюю схематычна можна пазначыць як пераход ад БССР, якая з'яўлялася часткай каласальнай савецкай прасторы, да незалежнай Рэспублікі Беларусь. Трансфармацыя суправаджаецца зменамі фундаментальнага характару, што параджае неабходнасць філасофскага асэнсавання.

Актуальным здаецца задаць два пытанні наконт увядзення паняцця «рэлігійная прастора Беларусі». Першае: чым абумоўлена яго слушнасць? Бо праз паняцці не толькі асэнсоўвацца рэчаіснасць, але і выяўляюцца яе новыя аспекты. І калі мы кажам аб рэлігійнай прасторы Беларусі, што гэта дае для аналізу той сутуацыі, у якой знаходзімся?

Другое пытанне: як тэарэтычна абгрунтаваць паняцце «рэлігійная прастора Беларусі»? Наколькі яно суадносіцца з характарам трактоўкі рэчаіснасці? А менавіта з «навуковай карцінай свету, ідэаламі і нормамі навуковага даследавання, філасофскімі падставамі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навукі» [1, с. 257]? Бо савецкае грамадства і, адпаведна, яго прасторавыя характарыстыкі мелі распрацаванае філасофскае абгрунтаванне. У прасторавым аспекце мы былі часткай сусветнай сацыялістычнай сістэмы, у часавым – «паспяхова» рухаліся да пабудовы камунізму. Зараз трэба ўжываць іншыя падыходы, прычым выходзячы менавіта з беларускай сітуацыі.

Пачнем з адказу на другое пытанне. Узорам для сучаснага разумення прасторы з'яўляецца абсалютная прастора Ньютона, якая ўмяшчае у сябе ўсё і мае субстанцыянальны характер. Але гэта разуменне супярэчыць штодзённаму ўспрыманню. Для нас прастора складаецца з шэрагу рознаякасных месцаў: дома, вуліцы, працы, крамы, музеяў і г. д. Яны не аднародныя. Іх адзінства абумоўлена прысутнасцю кожнага з гэтых месцаў у межах чалавечай дзейнасці. Адсюль вынікае палажэнне пра тое, што, паколькі людзі не аднолькавыя, таму яны маюць розныя жыццёвыя прасторы. Прастора, у якой чалавек жыве, можа мяняцца, пры пераездзе з аднаго месца ў другое, пашырацца альбо звужацца разам са зменамі ў жыцці.

Тое ж мы можам сказаць і пра прастору традыцыйнай беларускай культуры. Яна не была аднароднай, а ўяўляла сабой сукупнасць месцаў, звязаных з сялянскай жыццядзейнасцю. Адна справа – хата, якая была абжытой, у якой селянін адчуваў сябе ўтульна, зусім іншае – прастора леса, дзе, з аднаго боку, былі грыбы, ягады, дровы, але, з другога, жылі драпежнікі і можна было заблукаць.

Мы выходзім з наяўнасці шматлікіх рознаякасных прастораў. Апроч фізічнай ёсць яшчэ біялагічная, сацыяльная і іншыя. Прычым, у адрозненні ад прасторы класічнай механікі, яны не з'яўляюцца ізатропнымі. Прастора балота адрозніваецца ад прасторы пустыні. Таксама і прастора беларускай культуры адрозніваецца ад прасторы культур суседзяў. Гэта не адмаўляе іх аб'ектыўнага характару, але выяўляе разнастайнасць рэчаіснасці.

Калі мы кажам, што прастора ўтвараецца праз дзейнасць чалавека, трэба ўлічваць, што апошняя ажыццяўляецца не ў фізічным вакууме (які, дарэчы, таксама ўяўляе сабой тэарэтычны канструкт). Свет мае сваю структуру, якая задае магчымасці ўзаемадзеяння і, адпаведна, характар прасторавых утварэнняў. Калі мы параўноўваем такія блізкія краіны, як Беларусь і Расія, то каласальная тэрыторыя апошняй задае іншыя магчымасці для стварэння сацыяльнай, палітычнай, культурнай, рэлігійнай і другіх прастораў.

У першым набліжэнні выходзім з таго, што рэлігійная прастора ўтвараецца рэлігійнымі арганізацыямі, размешчанымі на адпаведнай тэрыторыі. Але пры далейшых разважаннях відавочна, што ў яе так-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сама трэба ўключыць месцы паломніцтваў, рэлігійныя навучальныя ўстановы, культавыя аб'екты (крыжы на раздарожжах, свяшчэнныя камяні, крыніцы), помнікі рэлігійным дзеячам, назвы вуліц (Манастырская, Саборная, Кальварыйская) і г. д.

Усё вышэй пералічанае утварае гарызантальнае вымярэнне религійнай прасторы. Яго асноўнай характарыстыкай з'яўляецца ступень прысутнасці рэлігіі, а паказчыкам – колькасць рэлігійных арганізацый і культавых объектаў, а таксама іх размеркаваннем па тэрыторыі краіны.

Згодна з дадзенымі Апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, на 1 студзеня 2021 г. у Беларусі зарэгістравана 3395 рэлігійных суполак [2]. Можна разглядзець шчыльнасць іх размяшчэння па рэгіёнах, канфесійную прыналежнасць, колькасны рост, а таксама параўнаць гэтыя паказчыкі з паказчыкамі іншых краін.

Мы лічым неабходным звярнуць увага на той відавочны факт, што прастора, у адрозненні ад плоскасці, мае таксама вертыкальнае вымярэнне. У выпадку рэлігійнай прасторы яно задаецца палажэннямі веравучэння. Пры гэтым розныя рэлігійныя накірункі маюць розныя веравучэнні і таму розныя прасторы.

Гэтая акалічнасць яскрава праяўляецца пры супастаўленні хрысціянства з язычніцтвам. Менавіта для першага, якое, дарэчы, з'яўляецца для нас узорам рэлігіі, уласціва супрацьпастаўленне зямнога і нябеснага свету. Калі першы – месца, якое чалавек павінен захоўваць і пераўтвараць у адпаведнасці са сваімі мэтамі, то другі – іншы, там зямныя ўяўленні не дзейнічаюць.

Нічога падобнага ў язычніцтве няма. Для яго характэрна прасторавая разнастайнасць, але таксама і цэласнасць. Напрыклад, згодна з традыцыйнымі беларускімі ўяўленнямі пасля смерці людзі незалежна ад полу і ўзросту, робяцца дзядамі і трапляюць у іншае месца, якое падобнае на гэтае, і захоўваюць свае звычкі. Калі чалавек любіў выпіць, яму клалі ў труну бутэльку з гарэлкай, курыць – тытунь, каб на тым свеце таксама можна было б атрымаць нейкія задавальненні. Памерлым продкам трэба было есці, і іх кармілі на свята Дзяды.

Шматмернасць рэлігійнай прасторы Беларусі задаецца, папершае, тым, што яе ўтвараюць розныя канфесіі. Яны могуць супадаць у сваім вертыкальным вымярэнні (напрыклад, у праваслаўя і каталіцтва адна і тая ж карціна свету), але адрозніваюцца ў гарызантальным, бо маюць розную структуру кіравання і па-рознаму размеркаваны на тэрыторыі краіны.

Па-другое, шматмернасць абумоўлена тым, што рэлігійная прастора мае гістарычны характар і сфарміраваная як вынік пэўных



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падзей і працэсаў. Асноўнымі сярод іх з'яўляюцца хрысціянізацыя нашых земляў, узаемадзеянне праваслаўя і каталіцтва, Рэфармацыя і Контррэфармацыя, савецкая атэістычная палітыка, наладжванне рэлігійнага жыцця ў сучаснай Беларусі. Вынікі гэтых падзей і працэсаў прысутнічаюць у нашай рэлігійнай прасторы. Мы можам параўнаць іх з культурнымі слаямі ў археалогіі.

Спецыфічнай рысай рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі, якая задае ў тым ліку і яе прасторавыя характарыстыкі, з'яўляецца поліканфесійнасць. На 1 студзеня 2021 г. у краіне зарэгістравана 25 канфесій. Самымі шматколькаснымі з'яўляюцца хрысціяне, іх суполкі складаюць 97,2 % ад агульнай колькасці. Але адсутнічае канфесія, якая магла б вызначыць спецыфіку рэлігійнай прасторы ў краіне, як гэта адбываецца ў нашых суседзяў з усходу і захаду. У Расіі на вызначэнне характару рэлігійнай прасторы прэтэндуе праваслаўе, у Польшчы – каталіцтва.

Таму асноўным фактарам фарміравання рэлігійнай прасторы ў сучаснай Беларусі з'яўляецца міжрэлігійны дыялог. Ініцыятарам яго правядзення з'явілася Беларуская праваслаўная царква, у прыватнасці – яе былы кіраўнік мітрапаліт Філарэт. Ён ажыццяўляўся на некалькіх узроўнях: сустрэчы кіраўнікоў, сумесныя праекты, міжнародныя канферэнцыі і г. д. У апошнія гады інтэнсіўнасць міжрэлігійнага дыялогу ў Беларусі некалькі паменшылася, але ён усё адно вядзецца.

Рэлігійная прастора сучаснай Беларусі з'яўляецца часткай сусветнай. Звычайна палажэнне нашай краіны апісваецца як знаходжанне паміж Еўропай і Расіяй. Прычым вызначальным лічыцца рэлігійны фактар: зыходзячы з таго, што праваслаўе – паказчык нашай сувязі з Усходам, каталіцтва і пратэстанцтва – з Захадам. У штодзённай свядомасці да гэтага часу дзейнічае схема «праваслаўе – руская вера, каталіцтва – польская». Пратэстанцтва ж быццам бы знаходзіцца па-за межамі беларускай культурнай і рэлігійнай прасторы.

Мы лічым гэты падыход састарэлым. Сітуацыю ў сучасным свеце вызначае працэс глабалізацыі, і ён таксама аказвае моцны ўплыў на фарміраванне рэлігійнай прасторы ў нашай краіне.

Праваслаўная царква ў Беларусі не з'яўляецца самастойнай, гэта частка Рускай праваслаўнай царквы. Але ж у свеце існуе пятнаццаць самастойных (аўтакефальных) праваслаўных цэркваў, якія фарміруюцца пераважна па дзяржаўнаму прынцыпу: Руская, Польская, Румынская і г. д. Паміж гэтымі цэрквамі не заўсёды існуюць прыязныя адносіны, найбольш яскравым прыкладам чаго з'яўляецца



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

раскол у праваслаўі суседняй Украіны. У канцы 2018 – пачатку 2019 г. па ініцыятыве кіраўніцтва краіны і пры падтрымцы Канстанцінопальскага патрыярха была створана Праваслаўная царква Украіны. Гэта выклікала рэзкую крытыку з боку Рускай праваслаўнай царквы і, як вынік, раскол у сусветным праваслаўі. Беларуская праваслаўная царква захоўвае вернасць Маскве, але тыя падзеі, якія адбыліся, закранаюць таксама і яе.

Каталіцтва, як паказвае ўжо ягоная назва (от грэч. *katholikos* – *усеагульны*), адрасавана ўсім людзям. Беларускія каталікі традыцыйна маюць сувязі з Польшчай, але на іх усё больш ўплыў аказваюць падзеі ў каталіцтве ў цэлым. Напрыклад, у Гомелі працуюць манашкі Ордэна Маці Тэрэзы (афіцыйная назва якога «Сёстры – місіянеркі любві»). Ён быў створаны ў 1950 г. у Індыі Агнес Годжэ Баяджыу, албанкай па нацыянальнасці, якая потым узяла сабе імя Маці Тэрэза. Таксама ў Навабеліцкім раёне ёсць вёска дзя дзяцей-інвалідаў, ад якіх адмовіліся бацькі. Пабудаваная яна на грошы каталіцкай царквы ў Аўстрыі, а працуюць з дзецьмі манашкі з ордэна Бенедыктынак-самарыцянак Крыжа Хрыстова.

Адной з характэрных рысаў пратэстанцтва з'яўляецца яго разнастайнасць. Зараз у свеце налічваецца некалькі сотняў пратэстанцкіх накірункаў. У Беларусі іх дванаццаць. Найбольш шматкольснымі з'яўляюцца неапратэстанцкія цэрквы: баптысты, пяцідзесятнікі, адвентысты і інш. У іх наладжаны шчыльныя сувязі з аднаверцамі ЗША і скандынаўскіх краін. Пры гэтым трэба ўлічваць, што пратэстанцтва ў перыяд Рэфармацыі аказала моцны ўплыў на фарміраванне рэлігійнай сітуацыі на беларускіх землях. Пратэстанцкімі прапаведнікамі былі такія вядомыя дзеячы нашай культуры, як Сымон Будны (1530–1593) і Васіль Цяпінскі (1530–1600). Таму, калі мы кажам пра рэлігійную прастору сучаснай Беларусі, неабходна ўлічваць таксама і тое, што ўнеслі ў яе фарміраванне пратэстанты. Тым больш, што другой канфесіяй па колькасці зарэгістраваных суполак пасля праваслаўя з'яўляюцца не каталікі, як гэта вельмі часта ўяўляюць, але хрысціяне веры евангельскай (пяцідзесятнікі). Апроч таго, пратэстанты вядуць актыўную місіянерскую дзейнасць, праз якую імкнуцца пашырыць рэлігійную прастору сваіх канфесій. Нам трэба ўлічваць, што спосабы фарміравання рэлігійнай прасторы ў праваслаўных, каталікаў і пратэстантаў вельмі істотна адрозніваюцца.

Рэлігійная прастора сучаснай Беларусі развіваецца. Адбываецца яе пашырэнне ў гарызантальным вымярэнні. Ідзе няўхільнае ўзрастанне колькасці зарэгістраваных суполак. За перыяд з 1988 па 2021 г. іх лічба ўзрасла больш чым у чатыры разы, з 765 да 3395.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Разам з колькасным ростам адбываецца таксама ўскладненне рэлігійнай прасторы. У выніку дзейнасці рэлігійных арганізацый больш адчувальнай робіцца іх прысутнасць у краіне. Таксама развіваецца міжрэлігійны дыялог і ўзаемадзеянне рэлігійных арганізацый з дзяржавай. Такім чынам, рэлігійная прастора робіцца больш насычанай і распаўсюджваецца на новыя сферы грамадскага жыцця. Напрыклад, у савецкія часы сфера дзейнасці рэлігійных арганізацый была абмежавана культам і «барацьбой за мір». Зараз яны могуць займацца дабрачыннасцю, адукацыяй, выхаваннем і г. д.

Калі казаць аб перспектывах развіцця рэлігійнай прасторы ў сучаснай Беларусі, то найбольш верагодным падаецца ўзмацненне яе спецыфікі ў параўнанні з суседзямі, а таксама паступовая інтэграцыя ў рэлігійную прастору Еўропы праз ажыццяўленне прынцыпа свабоды сумлення і ўзмацненне прысутнасці рэлігійных арганізацый у грамадскім жыцці краіны.

## Спіс крыніц і літаратуры

1. Степин, В. С. Теоретическое знание / В. С. Степин. – М.: Прогресс-Традиция, 2003. – 744 с.

2. Религиозные общины в Республике Беларусь (на 1 января 2021 г.) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://belarus21.by/articles/kolichestvo-religioznyh-obshhin-v-respublike-belarus-na-1-yanvarya-2019-g. – Дата доступа: 22.10.2021.

УДК 316.74:2:378.18(476.2)

**И. В. Попов**
ГГУ имени Ф. Скорины, г. Гомель

# РЕЛИГИОЗНОЕ ЗНАНИЕ И КУЛЬТУРА СТУДЕНТОВ (ПО ДАННЫМ ОПРОСА СТУДЕНТОВ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ)

*Данное исследование посвящено уровню знаний об авраамических религиях и связанной с ними культуре среди студентов ГГУ им. Ф. Скорины. Также делается попытка дать объяснение результату опроса. Установлено, что в результате секуляризационных процессов было искажено пред-*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ